Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

Бібліятэка АН БССР

Смерць нямецкім акупантам!

# За Савецкую Радзіму

24 (43)
ЧАЦВЕР
18
МАЯ
1944 г.

Орган Уздзенскага РК КП(б)Б

Ніякія суровыя выпрабаванні не зламалі нашай веры у перамогу над ворагам, не зламалі нашай упартасці і нашай рашучасці змагацца з нямецкімі захопнікамі да поунага вызвалення роднай Беларусі.

## НЕ ЗЛАМАЦЬ ФАШЫСЦКИМ ИЗВЕРГАМ НАШАЙ ВОЛИ ДА БАРАЦЬБЫ!

Гераичная Чырвоная Армия сакрушительными ударами цяжка ранила фашысцкага звера, який, агрызаючыся, адпаузае у свaё звярыные логава—Германию. Асталися личаныя дни иснавання фашысцкага звера на нашай зямли.

У прадсмертных сударгах фашысцкия изверги яшчэ больш абнаглели и з дзикасцю шаленага зваруги руйнуюць наш край, знишчаюць совецких людзей. З таго часу, як иснуе чалавек, гисторыя не ведала таких катаванняу и здзекау, якия прыдуманы нямецкими катами.

Раненны фашысцки звер имкнецца знишчыць увесь беларуски народ да аднаго чалавека. Для знишчэння мирных жыхароу фашысцкия душагубы пускаюць у ход танки. 28 красавика 1944 года гитлерауския шакалы абстраляли з танкау мирных жыхароу в. Мрочки, нашага раёна. У час гэтага бандыцкага абстрэла амаль палавина вески спалена.

11 и 14 мая фашысцкия бандыты пусцили у ход баявыя самалеты на вески нашага раена. Запальваючыя и фугасныя бомбы вялiкай разбуральнай силы кидали яны на сялянския будынки, а уцякаючых людзей расстрэльвали з кулямётау и гармат. У нашым раёне немцы разбамбили вёски Магильнае, Сутки, Паледзи, Смаляры, Пасечки, у яких спалена звыш 194 будынкау. Ад гэтага нечуванага бандыцкага тэрора гитлераунцау забиты и пакалечаны ни у чым невинныя мирныя людзи. Згарэла многа хлеба, маёмасци и жывёлы. И гэтаны, мярзауцы, называюць „новым парадкам" на акупираванай ими тэрыторыи.

Яны знишчаюць нашых людзей на катарэе у Германии и у лагерах смерци. Шляхам аблау гитлерауския галаварэзы ловяць и зганяюць туды совецких людзей. Так, 13 мая у м. Узда немцы и их халуи—палицаи акружыли базар, схвацили 70 мирных жыхароу и пагнали их на катаргу у Германию, а астатних раздзели да нацельнай бялизны и, збиушы, разагнали.

Але чым больш лютуе вораг, тым глыбей ён капае сабе магилу, тым больш узрастае народная помста да яго. Не страх вызывае у совецких людзей фашысцки тэрор, а лютую ненависць да ворага. Не зламаць фашысцким извергам нашай воли да барацьбы!

**Працоуныя Уздзеншчыны!**

Прымайце усе меры ад паветраных налётау ворага.

Будуйце бомбасховишчы, ухадзице у лясы, хавайце маёмасць и жывёлу. Не збирайцеся вяликим; грукам и. Своечасова разгадвайце усе намярэнни ворага, паведамляйце аб их партызанам. Устанауляйце ахову сваих мест жыхарства. Не паддавайцеся ни на якия правакацыи ворага, ухиляйцеся ад угона у нямецкае рабства, у лагеры смерци. Не гледзячы на усе цяжкасци, праводзьце сеу.

**Партызаны и партызанки!**

Усими мерами и сродками абараняйце наш народ ад знишчэння нямецкими катами. Бязлитасна помсцице фашысцким мярзотникам за спаленыя гарады и вески, за загинуушых родных и близких, за тых, катория гибнуць у нямецкай няволи.

Паможам-жа гераичнай Чырвонай Армии дабиць нямецкага звера!

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

На працягу **11 и 12 мая** на плацдарме правага берага раки **Днестр**, на паучочны заход ад г. **Тирасполь**, нашы войски адбивали атаки буйных сил пяхоты и танкау працiуника и нанесли яму вяликия страты у жывой силе и тэхницы. У вынику упорных двухдневуных баеу нашыми войсками падбита и знишчана да 100 нямецких танкау. Працiуник страцiу тольки забитыми больш 4000 сваих салдат и афицэрау.

**У Крыму** войски **4-га Украинскага фронта 12 мая** поунасцю закончыли ликвидацыю астаткау войск працiуника у раене мыса **Херсанес**.

На працягу з 13 па 17 мая на франтах истотных змен не адбылося.

## Дзеянни нашай авиацыи

У ноч на 11 мая наша авиацыя дальняга дзеяння зрабила масираваны налёт на чыгуначны вузел **Люблин** и падвергла бамбардыроуцы скапленне воинских эшалонау, а у ноч на 14 мая бамбила скапленне воинских эшалонау и ваенныя склады працiуника на чыгуначных вузлах **Брэст, Полацк и станцыи Нарва.**

◆◆ У ноч на 16 мая нашы самалёты бамбили чыгуначны вузел **Полацк.**

◆◆ У ноч на 17 мая наша авиацыя дальняга дзеяння бамбардыравала скапленне воинских эшалонау и ваенныя склады працiуника на чыгуначных вузлах **Минск, Баранавичы, Холм** (заходней Ковеля).

У вынику бамбардыроуки на чыгуначным вузле Минск узникла 7 ачагоу пажарау, якия пасля злилися у адзин вялики пажар. Такой-жа интэнсунай бамбардыроуцы были падвергнуты Баранавичы и Холм.

Жр 3178



## Адпомсцим! Не даруем!

11 и 14 мая г. г. гитлерауския сцярвятники падвергли апусташальчай бамбардыроуцы вёски Сутки, Паледзи, Смаляры и Пасечки, нашага раёна. З усмешкаю людаедау на свацх зварыных мордах фашысцкия паветраныя пираты кидали на мирныя вёски фугасныя и запальваючыя бомбы, руйнавали и палили сялянския хаты и будынки, страляли з кулямётау и гармат па жанчынах, дзецях, старых, якия у страху и роспачы уцякали у лес.

Варварски паветраны налёт нямецких людаедау прычынил насельництву гэтых вёсак цяжкия страты. Только у Сутках и Паледзях фашысцкими бомбами зруйнавана и спалена 23 дамы, 29 хлявоу, 12 гумен и 36 других будынкау. Фашысцкия грамилы прынесли сялянам страт больш чым на 1 мильён рублёу.

У час зладзейскага паветранага налёта фашысцких сцярвятникау забиты и пакалечаны нявинныя людзи, дарослыя и дзеци, старыки и жанчыны.

Пралитая кроу нашых мацярок и дзяцей, братоу и сясцёр, попел спаленых вёсак кличуць нас люта помсциць фашысцким крыважэрным зварам.

И мы адпомсцим! Не даруем! Не аднаго яшчэ вашага фрыца утопим у яго чорнай паганай крыви.

Працоуныя! Нямецки звер подлы и каварны. Ен не павинен вас застаць урасплох. У час налета фашысцких самалётау усе, як адзин,—у бамбасховишчы! У каго няма бамбасховишча — неадкладна пабудуйце! Маемасць и жывёлу схавайце у лесе! Пры з'яуленни наземных банд фашыстау скрывайцеся и паведамляйце аб гэтым партызанам.

Калюжны.

## Катам не уцячы ад расплаты

Адборныя банды гитлераускиx забойцау и рабаунникоу „ахоцяцца" за насельництвам нашых гарадоу и вёсак, хватаюць першага папаушагася пад руки, грабяць яго, забиваюць ци уганяюць у нямецкае рабства.

Так было 13 мая г. г. у м. Узда. З акаляючых вёсак у Узду прыехали на кирмаш сяляне. Калi на базарную плошчу сабралася многа народу, гитлераууцы и их халуи бобики-палицэи акружыли яе, пасля чаго ашалелыя нямецкия звяры пачали гвалтаваць мирных людзей. Усих, хто быу на плошчы, каты сагнали у адно месца. Яны схвацили 70 чалавек. абрабавали их да нитки и пагнали на катаргу у сваё зварынае логава—Германию. А астатних, раздзеушы данацельнай бялизны, нямецкия изверги збили и разагнали.

Ци-ж можна даравать фашысцким сабакам их зварывы здзек над нашыми людзьми? Николи! Катам не уцячы ад расплаты! У агни нашай палаючай помсты будуць бязлитасна знишчаны двуногия нямецкия звяры.

**Працоуныя Уздзеншчыны!**

Немец-душагуб imкнецца знишчыць наш народ, абрабаваць и апустошыць наш край. Своечасова разгадвайце яго людаедски намер. Не пападайцеся у зварыныя лапы фашыстау, не наведвайце Узду.

Усими силами и сродками дапамагайце народным мсцицам знишчаць подлых захопникау.

Иван Падгорны.

## Эшалон не дайшоу на фронт

12 мая г. г. дыверсийная група партызанскага атрада имени К-ва пад камандай тав. С-га памиж чыгуначными станцыями С.—Б. пусцила пад адкос нямецки эшалон з ваеннай тэхникай. Разбиты паравоз, тры вагоны и дзве платформы з грузами.

Яшчэ адзин фашысцки эшалон не дайшоу на фронт.

Партызан Алесь Ц.

## У адказ на загад правадыра

Першамайски загад Вярхоунага Галоунакамандуючага таварыша Сталина вызвау сярод партызан нашага раёна новы баявы пад'ём. Дапамагчы Чырвонай Армии ачысциць ад фашысцких гадау усю нашу зямлю и аднавиць нашы дзяржауныя границы па усёй линии ад Чорнага мора да Барэнцава мора,—з таким лозунгам идуць народныя мсцицелы на выкананне баявых заданняу.

За перыяд з 7 па 12 мая падрыуныя групы совецких патрыетау пусцили пад адкос нямецки воински эшалон з тэхникай, узарвали 7 варожых аутамашын з рознымi грузами, выразали 8000 метрау сувязи ворага, забили 8 и ранили 5 паршывых фрыцау.

Мужна и нястомна дзейничаюць падрыуники на чале з т. т. Малчанавым, Р., Сашам К. з атрада „П. Р.".

Партызан Грыша М.

## Баи у Югаславии

Жанева, 14 мая. (ТАСС).

Як паведамляюць з Югаславии, вярхоуны штаб народна-вызваленчай армии Югаславии паведамляе, што у час нямецкага наступлення и контрнаступлення народна-вызваленчай армии у Чорнагорыи и Наудвёвым Санджаку з 5 красавика па 5 мая забита 2745 и узята у полон 112 варожых салдат и афицэрау. Захоплены багатыя трафеи. За гэты перыяд ачышчана не тольки тэрыторыя, якую немцам удалося заняць у першыя дни наступлення, але вызвалены ад працивника новыя раены. Страты народна-вызваленчай армии 900 чалавек забитыми и ранеными

У Усходняй Боснии працягваюцца упорныя баи з буйными силами працивника у сектары Власеница-Рогатица.

У Славонии и Славении часци народна-вызваленчай армии вядуць наступальныя аперацыи.

РЭДКАЛЕГИЯ